**ПЕРШЫ ЭТАП РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ “БЕЛАРУСКАЯ МОВА” І “БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА”**

**2022/2023 навучальны год**

**11 клас**

**Комплексная работа**

| *Заданні* | *1* | *2* | *3* | *4* | *5* | *6* | *7* | *8* | *9* | *10* | *Усяго* |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | | | | | | | | | | | |

**Заданне 1. Адзначце правільныя сцверджанні:**

*Колькасць балаў – 6*

1. Мастацкі, афіцыйны, гутарковы і публіцыстычны стылі адносяцца да кніжных стыляў маўлення.
2. Слуханне, гаварэнне, чытанне, пісьмо – віды маўленчай дзейнасці.
3. Дзеепрыслоўе – асобая зменная форма дзеяслова.
4. У сказе можа быць толькі адзін галоўны член – дзейнік або выказнік.
5. У беларускай мове шэсць самастойных часцін мовы.
6. Лічэбнік 'дзевяноста' пры змяненні па склонах мае толькі адну форму.
7. Прыслоўі ўтвараюцца толькі ад назоўнікаў і прыметнікаў.
8. Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках у цяперашнім і будучым простым часе абвеснага ладу называецца спражэннем.
9. Паводле інтанацыі сказы могуць быць пытальныя і пабуджальныя.
10. Лічэбнік самастойна або ў саставе колькасна-іменнага спалучэння можа быць любым членам сказа.

**Заданне 2. Устаўце прапушчаныя літары:**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Пр..стыжны | Бес..дзь |
| Г..рбарый | Ч..мадан |
| Тры.. | Роўн..дзь |
| Атракцы..н | Фі..лка |
| Ц..рымонія | Ж..ніх |
| Т..рмометр | Ж..мчужына |

**Заданне 3. Выпішыце словы, для якіх няправільна ўказаны словы, ад якіх яны ўтвораны. Запішыце правільны варыянт, вызначце спосаб словаўтварэння.**

*Колькасць балаў – 6*

Прытэрасны ← тэрасны
Тлустасць ← тлушч.
Цырульніца ← цырульнік.
Распарадак ← распарадзіцца.
Сінтэтыка ← сінтэтычны.
Выстрал ← выстраліць.

**Адказ:** ______________________________________________

______________________________________________________

______________________________________________________

**Заданне 4. З прыведзеных ніжэй слоў узнавіце і запішыце ў табліцу фразеалагізмы. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы.**

*Колькасць балаў – 6*

А. Неба, як, зваліцца, з.
Б. Не, зуб, зуб, на, трапляе.
В. На, хадзіць, задніх, лапках.
Г. Вырас, з-пад, нібыта, зямлі.
Д. Неба, сярод, яснага, як, гром.
Е. Пальцаў, пяць, як, на, свае, руцэ.

| | |
|---|---|
| А. | 1. Прыслугоўваць, дагаджаць. |
| Б. | 2. Нечакана, раптоўна. |
| В. | 3. Неспадзявана, нечакана з’явіцца. |
| Г. | 4. Раптам, нечакана ўзнік, з’явіўся. |
| Д. | 5. Грунтоўна, вельмі добра (ведаць што-небудзь). |
| Е. | 6. Хтосьці калоціцца, дрыжыць ад страху ці холаду. |

**Адказ:**

**Заданне 5. Ад прыведзеных назоўнікаў з дапамогай суфікса –ск- утварыце прыметнікі і запішыце ў адпаведнасці з правіламі арфаграфіі:**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Адвакат – | Івацэвічы – |
| Жнівень – | Язычнік – |
| Нясвіж – | Мецэнат – |

**Заданне 6. Вызначце, якой часцінай мовы з’яўляюцца выдзеленыя словы, запішыце.**

*Колькасць балаў – 6*

1. Ганна ішла **поба**ч з возам.
2. Міша **вельмі** хацеў паехаць у падарожжа.
3. Не дазваляй **сабе** ленавацца.
4. “**Эх**, заўтра будзе дождж”, – падумаў Мікола.
5. **Ну і** навіны – адна за другую цікавейшыя.
6. І адразу прыгадалася ўсё, **што** адбылося сёння.

**Адказ**:1)_______________
2)______________
3) ______________
4)________________

5)______________
6)______________

**Заданне 7. Запішыце дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| Біць – | Адзначаць – |
| Берагчы – | Жыць – |
| Аддаваць – | Класці – |

**Заданне 8. Вызначце ў кожным радзе памылковую склонавую форму назоўніка і запішыце правільную форму.**

*Колькасць балаў – 6*

1) Давяраць дзядуле, брату, маме;
2) сумаваць па маці, па Васілю, па субяседнікe;
3) працаваць у кузне, у лабараторыі, у інстытуце;
4) думаць аб кавалі, аб браце, аб вераб'і;
5) Маша з Пецей, з Віцькам, з Толем;
6) ісці па сцяжынцы, па гравію, па кладцы.

**Адказ:** 1) ________________
2) _________________
3)_____ ____________
4)__________________
5)__________________
6)__________________

**Заданне 9. Прачытайце. Вызначце назву і аўтара твора.**

*Колькасць балаў – 6*

1. Я чую. … Я чую, як шуміць вецер, як размаўляюць вясною ручаі, як крычаць кнігаўкі, што прыляцелі на паплавы і лугі. Я чую шэпт першых лісцяў, гарачы, добразычлівы шэпт аб тым, што вось як прыгожа вакол… Калі і як такое са мною здарылася – я і сам сказаць не магу. Але ж здарылася! За доўгія месяцы ўпартай вучобы і працы! Нічога як быццам не адбылося асаблівага, і раптам усё уварвалася ў вушы.

Нібы мяне закружыла ў радаснай прыгажосці жыцця.

**Аўтар___________________, назва твора___________________**

2. Улетку ён рабіў зондэрфюрэру печы. Знайшлі яго і прывялі, вядомага на ўсю ваколіцу. Пяць раніц дзяжурны жандар абшукваў яго і кожны раз аднолькава знаходзіў у кішэнях майстра тое самае крэсіва, самасад і кавалак чорнага хлеба. А печы атрымаліся выдатныя. Кухар хваліць пліту, а сам зондэрфюрэр – грубку з белай кафлі. Вось і цяпер ён ледзь не заахкаў на ўспамін аб яе гладкай цеплыні.

**Аўтар___________________, назва твора___________________**

3. … Ён размашыста правёў касой, і трава шыркнула, паслухмяна лягла злева акуратнай купкай. Ён правёў другі раз, трэці, трава злева стала выцягвацца ў вільготны зялёны рад. Хутка ногі яго ступілі на пакошу, перад ім быў ужо лапік чыстага, скошанага ім. Хто гэта казаў, што ён яшчэ зялёны касіць? Што яму, быццам, кашы яшчэ многа трэба!

**Аўтар___________________, назва твора___________________**

**Заданне 10. Выпішыце назвы радкоў (напрыклад, літары А, Б, Д), якія адлюстроўваюць ход развіцця беларускай літаратуры і дзе ўсе тры слупкі па сэнсе адпавядаюць адно аднаму. Вазьміце пад увагу, што ў табліцы прыведзены імёны пісьменнікаў, псеўданімы, назвы твораў, імёны персанажаў, гісторыка-літаратурныя факты і інш.**

*Колькасць балаў – 10*

| | | | |
|---|---|---|---|
| А | Францыск Скарына | Прадмова да кнігі «Новая зямля» | Полацк |
| Б | Максім Багдановіч | «Вянок», 1913 | «Маёвая песня» |
| В | Якуб Колас | «Паскудства, брат, і не пытайся!» | Дзядзька Антось |
| Г | Самуіл Плаўнік | Пісьменнік паказае майстэрства ў раскрыцці думак і перажыванняў Тэклі, якая наведвае сына | Змітрок Бядуля |
| Д | Аркадзь Куляшоў | Уладзімір Мулявін | «Алеся» |
| Е | Мікалай Карлавіч Раманоўскі | Бацькі і дзеці: праблемы гуманнасці, высакароднасці, сумленнасці. | Аўтар дае характарыстыку Даніку Мальцу праз канкрэтныя выразныя дэталі. |
| Ж | Іван Дамінікавіч Луцэвіч | Праўда Сымона і праўда Зоські. Старац як выразнік народнай маралі. | «Новая зямля» |
| З | Юрый Казакоў | Максім Багдановіч | Мінск |
| І | Максім Танк | Яўген Іванавіч Скурко | “Ля вогнішч начлежных” |
| К | Ядвігін Ш | Антон Лявіцкі | “Дуб-дзядуля” |

**АДКАЗ:** ___________________

**Комплексная работа**
**11 клас**

## ДАВЕДКІ

**Заданне 1.** 2, 4, 5, 6, 8, 10

**Заданне 2. Устаўце прапушчаныя літары:**

| | |
|---|---|
| Прэстыжны | Бесядзь |
| Гербарый | Чамадан |
| Трыа | Роўнядзь |
| Атракцыён | Фіялка |

| | |
|---|---|
| Цырымонія | Жаніх |
| Тэрмометр | Жамчужына |

**Заданне 3.**
Прытэрасны ← тэраса, прыставачна-суфіксальны спосаб.
Тлустасць ← тлусты, суфіксальны спосаб.
Распарадак ← парадак, прыставачны спосаб.

**Заданне 4. З прыведзеных ніжэй слоў узнавіце і запішыце ў табліцу фразеалагізмы. Суаднясіце змест дзвюх частак табліцы.**

*Колькасць балаў – 6*

| | |
|---|---|
| А. Як з неба зваліцца | 1. Прыслугоўваць, дагаджаць. |
| Б. Зуб на зуб не трапляе | 2. Нечакана, раптоўна. |
| В. Хадзіць на задніх лапках | 3. Неспадзявана, нечакана з'явіцца. |
| Г. Нібыта з-пад зямлі вырас | 4. Раптам, нечакана ўзнік, з'явіўся. |
| Д. Як гром сярод яснага неба | 5. Грунтоўна, вельмі добра (ведаць што-небудзь). |
| Е. Як свае пяць пальцаў на руцэ | 6. Хтосьці калоціцца, дрыжыць ад страху ці холаду. |

Адказ: А 3, Б 6, В 1, Г 4, Д 2, Е 5

**Заданне 5. Ад прыведзеных назоўнікаў з дапамогай суфікса –ск- утварыце прыметнікі і запішыце ў адпаведнасці з правіламі арфаграфіі:**

| | |
|---|---|
| Адвакат – адвакацкі | Івацэвічы – івацэвіцкі |
| Жнівень – жнівеньскі | Язычнік – язычніцкі |
| Нясвіж – нясвіжскі | Мецэнат – мецэнацкі |

**Заданне 6**.
1. Прыназоўнік. 2. Прыслоўе. 3. Займеннік. 4. Выклічнік. 5. Часціца.
6. Займеннік.

**Заданне 7. Запішыце дзеясловы ў форме 2-й асобы множнага ліку.**

| | |
|---|---|
| Біць – б'яце | Адзначаць – адзначаеце |
| Берагчы – беражаце | Жыць – жывяце |
| Аддаваць – аддаяце | Класці – кладзяце |

**Заданне 8. Вызначце ў кожным радзе памылковую склонавую форму назоўніка і запішыце правільную форму.**
1. Дзядулю. 2. Па субяседніку. 3. У кузні. 4. Аб кавалю. 5. З Пецем. 6. Па гравіі.

**Заданне 9. Прачытайце. Вызначце назву і аўтара твора.**
1. Мікола Лупсякоў. "Мэры Кэт"

2. Янка Брыль. “Memento mori”
3. Іван Мележ. “Людзі на балоце”

**Заданне 10**. Б, В, Г, З, І, К